


✓З **6 лютага** ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе выстава **«Жыццё як час сарванай ружы»**, прымеркаваная да 70-годдзя з дня нараджэння мастака і паэта Фёдара Ястраба (1953 – 2014). Гэты таленавіты чалавек быў аўтарам і куратарам безліч выстаў і выставачных праектаў, заснавальнікам і першым загадчыкам аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У экспазіцыі прадстаўлены працы мастака ад ранніх да створаных у апошнія гады яго жыцця. Выстава дае ўнікальную магчымасць зазірнуць у майстэрню мастака, адчуць атмасферу працы, выбару, навучання, эксперыменту, разважання, творчай весялосці, тугі і пошуку. Значная частка работ дагэтуль ніколі не экспанавалася. Прадстаўлены і дзве жывапісныя работы, падараваныя аўтарам у калекцыю бібліятэкі ў 2010 годзе, – «Кінутыя лодкі» (2006) і «Сустрэча з аднарогам» (2005).

У апошнія гады жыцця мастака жывапіс саступіў паэзіі прастору самавыяўлення і самапазнання. Каля тысячы санетаў Фёдара Ястраба сабраны ў прадстаўленых на выставе скарбонках-зборніках «Абяцанне сноў», «Вясёлкавы след», «Жыццё як час сарванай ружы», «Таўро», «Маленне агню і ветру». Экспануюцца таксама часопісы, матэрыялы

навуковых канферэнцый, аўтарскія мастацтвазнаўчыя артыкулы і артыкулы аб жыцці мастака, яго дзейнасці і творчасці, альбомы, каталогі выстаў і праектаў.

Выставу можна наведаць да 9 красавіка.